

У дзень свайго 95-годдзя Мікалай Габрыновіч прымаў віншаванні ад Юліі Паплёўка і Юліі Гамбіцкай.

**ВІНШАВАННІ ВЕТЭРАНУ ВАЙНЫ**

# Месца работы адно – чыгунка

**Ветэран Вялікай Айчыннай вайны Мікалай Габрыновіч 19 снежня адзначыў свой 95-ы дзень нараджэння. Гэта дата не засталася незаўважанай для яго калег са станцыі Маладзечна.**

45 гадоў Мікалай Іванавіч аддаў чыгунцы. Ён пачаў свой працоўны шлях у снежні 1944-га рабочым. У мірны час працаваў тэхнікам, дзяжурным памочнікам начальніка, старшым аператарам ільдапункта, на пенсію пайшоў з пасады старшага аператара грузавой службы станцыі Маладзечна.

— Для нас Мікалай Іванавіч з'яўляецца прыкладам працавітасці, патрыятызму, сумленнага выканання грамадзянскага абавязку. Гэта чалавек, які і ў свае 95 гадоў поўны энергіі і станоўчых эмоцый, — гаворыць намеснік начальніка станцыі чыгуначнай па ідэалагічнай рабоце, кадрах і сацыяльных пытаннях Юлія Паплёўка, якая віншавала ветэрана разам з вузлавым сакратаром пярвічнай арганізацыі БРСМ Юліяй Гамбіцкай і сакратаром пярвічнай арганізацыі ветэранаў Таццянай Дарафейчык.

З любоўю падрыхтаваны «пярвічкай» прадуктовы набор будзе вельмі дарэчы да святочнага стала. А цёплыя віншаванні, словы падзякі за працу будуць доўга саграваць сэрца ветэрана.

**Анжаліка КРУПЯНЬКОВА.**
**Фота: архіў СТАНЦЫІ МАЛАДЗЕЧНА.**